# ТЭАТРАЛЬНАЯ ГАСЦІНАЯ “ЧАРОЎНЫ СВЕТ КАЗКІ”. ЗАБАВА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5–6 ГАДОЎ)

**Гродзінская Яўгенія Ігараўна,**
музычны кіраўнік першай катэгорыі
ДУА “Дзіцячы сад № 12 г. Полацка”

## *Тэатр фармуе любоў да Радзімы і фальклору*

*Важную ролю ў сучаснай адукацыі займае патрыятычнае выхаванне. Выхаванне маленькага патрыёта пачынаецца з самага блізкага для яго – сям’і, роднага горада, дома і, вядома ж, роднай мовы. Беларускія народныя казкі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, знаёмяць дзяцей з беларускай мовай з асаблівай цікавасцю. Самабытны народны фальклор – выдатны матэрыял, які фарміруе любоў да Радзімы і патрыятычнае развіццё дзяцей. А калі не проста паслухаць казку, а самому апынуцца яе героем?*

*Тэатр з’яўляецца адной з самых даступных ўспрыманню дашкольніка сфер мастацтва. Ён развівае ўяўленне і фантазію, спрыяе творчаму развіццю дзіцяці і фармуе яго асобасную культуру. Тэатралізаваная дзейнасць спрыяе развіццю гаворкі дзяцей, эмацыйнай сферы, камунікатыўных уменняў, дапамагае разняволенню.*

*Сцэнарый тэатральнай гасцінай “Чароўны свет казкі” дапамагае бліжэй пазнаёміцца з беларускім народным фальклорам праз тэатралізаваную дзейнасць і ў цэлым абагульніць веды пра тэатр. За аснову тэатральнай пастаноўкі ўзята добра знаёмая дзецям беларуская народная казка “Каза-манюка”. У сцэнарый забавы ўключана адна з тэхналогій візуалізацыі – кросенс – які дапамагае дзецям замацаваць паняцце «тэатр».*

**Праграмныя задачы:** развіваць моўныя і агульныя музычныя здольнасці; фарміраваць уменне ўважліва слухаць і выразна расказваць мастацкія творы на беларускай мове, прымяняць раней вывучаныя песні, танцы, гульні, музіцыраванне ў розных відах эстэтычнай дзейнасці; замацаваць паняцце “тэатр” праз тэхніку візуалізацыі “кросэнс”; выхоўваць станоўчае стаўленне да беларускай мовы, жаданне на ёй размаўляць праз музычна-творчую дзейнасць.

**Матэрыял і абсталяванне:** лаўка, стол, абрус, кубачкі, талеркі, гарлач, печ, каса, хустачка, плот, хатка, елачкі, драўляная лыжка, музычныя інструменты, дзіцячыя беларускія нацыянальныя касцюмы, элементы касцюмаў для казы, дзеда, бабы, дачкі, зайчыка, воўка, мядзведзя, пеўніка, касцюм Дзеда-Барадзеда, прэзентацыя “Чароўны свет казкі”, тэлевізар, ноўтбук, музычны цэнтр, аўдыязапісы вясёлай беларускай музыкі, песні “Дзед-барадзед” (сл. А. Вольскага, муз. Л. Захлеўнага), беларускага народнага танца “Лявоніха”, вясёлай беларускай музыкі, музыкі на выхад герояў, фанаграмы песні “Бывайце здаровы” (сл. А. Русака, муз. І. Любана).

**Дзеючыя асобы:** Дзед-Барадзед – дарослы; каза, дзед, баба, дачка, зайчык, воўк, мядзведзь, певень – дзеці.

**Ход музычнай забавы**

*Гучыць вясёлая беларуская народная музыка, дзеці ўваходзяць у залу, становяцца свабодна.*

***Музычны кіраўнік.*** Я вельмі рада бачыць вас, усіх вітаю ў гэты час.

**Прывітанка “Ці ўсе ёсць?”**

Ці ўсе ёсць? Вітаем вас!
*Махаем рукамі, вітаем.*
Пачынаем, бо ўжо час.
Ёсць тут мы, ёсць і вы!
*Паказваем пальцам на сябе і на іншых.*
Раз, два, тры!
*Пляскаем у далоні!*

***Музычны кіраўнік.*** Дзеці, я сёння слухала такую цікавую песеньку, яна мне так спадабалася! А вы хочаце яе паслухаць?

***Дзеці.*** Так!

***Музычны кіраўнік.*** Падыдзіце бліжэй да тэлэвізару.

*Дзеці падыходзяць.*

Прагляд відэафрагмента песні “Дзед-Барадзед”.

***Музычны кіраўнік.*** Спадабалася вам гэтая песенька?

***Дзеці.*** Так!

***Музычны кіраўнік.*** А пра каго яна?

***Дзеці.*** Пра Дзеда-Барадзеда.

***Музычны кіраўнік.*** Так. Пра Дзеда-Барадзеда, які ведае шмат цікавых казак. А можа, нам яго да сябе ў госці паклікаць, каб было весялей?

***Дзеці.*** Так!

***Музычны кіраўнік.*** Тады, калі ласка, сядайце.

*Дзеці сядаюць.*

***Музычны кіраўнік.*** Трэба разам наступныя словы казаць:

“Казкі любім і чытаем,
Дзеда-Барадзеда запрашаем!”

*Пад музыку выходзіць Дзед-Барадзед.*

***Дзед-Барадзед.*** Добры дзень усяму добраму люду. Прывітанне, мае дзетачкі-кветачкі!

***Дзеці.*** Прывітанне!

***Дзед-Барадзед.*** Я Дзед-Барадзед. Людзі мяне любяць за тое, што ўсюды бываю, шмат цікавага ведаю. Хачу вас запытаць: а ці даспадобы вам загадкі?

***Дзеці.*** Так!

***Дзед-Барадзед.*** Гэта добра! Тады слухайце ўважліва!

*Дзед-Барадзед па чарзе чытае загадкі, пасля адказу на экране тэлевізара з’яўляюцца адгадкі.*

У лесе, пушчы не спаткаеш
Яго завейнаю зімой,
Бо ён салодка спачывае
Пад белай коўдрай снегавой. *(Мядзведзь)*

Ён адмысловы
Будзільнік вясковы.
Заводзіць не трэба,
Ды трэба карміць,
І будзе ён ранкам
На працу будзіць. *(Пеўнік)*

Драпежнік ёсць адзін лясны,
Ён шэры, страшны, вельмі злы.
На месяц ноччу вые…
Што за звер такі ён? *(Воўк)*

Узімку на снезе зусім непрыкметны,
На шэрым пяску будзе шэрым улетку.
Ён футрачкі колер старанна мяняе –
Баіцца ваўка і ад ліскі ўцякае. *(Заяц)*

З барадою, а не стары,
З рагамі, а не бык,
Дояць, а не карова,
Лыкі дзярэ, а лапці не пляце. *(Каза)*

***Дзед-барадзед.*** Усе загадкі адгадалі! А ў якой беларускай казцы сустракаюцца ўсе гэтыя жывёлы?

***Дзеці.*** Каза-манюка!

***Дзед-Барадзед.*** Вельмі цікавая казка!

***Музычны кіраўнік.*** Дзеці! Што я прыдумала… Падыдзем зноў да тэлевізара бліжэй.

*Дзеці падыходзяць.*

**Кросэнс “Тэатр”**

***Музычны кіраўнік.*** Казку “Каза-манюка” мы ведаем добра… (1. Каза-манюка) Вы сёння апрануты ў прыгожыя касцюмы (2. Касцюм), як сапраўдныя хто?

***Дзеці.*** Акцёры! (3. Акцёры)

***Музычны кіраўнік.*** У нашай музычнай зале ёсць дэкарацыі (4. Дэкарацыі), якія?

***Дзеці.*** Дом, лаўка…

***Музычны кіраўнік.*** Музычная зала, як сцэна (5. Сцэна), на якой можна спяваць, плясаць, у гульні гуляць (6. Музыка). Да нас прыйшлі госці – гледачы, якім мы можам усё гэта паказаць (7. Гледачы), а дапамагаць нам можа Дзед-Барадзед (8. Рэжысёр), які добра ведае ўсе казкі! І ў нас з вамі атрымаецца сапраўдны…

***Дзеці.*** Тэатр! (9. Тэатр)

***Музычны кіраўнік.*** Сардэчна ў тэатр наш запрашаем, цікавую казку для вас пачынаем!

Акцёры, займаем свае месцы!

*Дзеці разыходзяцца па сваіх месцах.*

***Дзед-Барадзед.*** Глядзіце, слухайце! Казка “Каза-манюка”.

*Гучыць вясёлая музыка.*

***Дзед-Барадзед.*** Жылі дзед ды баба з дачкою. І была ў іх каза – вясёлая!

***Каза.*** Вельмі я люблю гуляць ды спрытна танцаваць!

*Выходзяць усе дзеці, становяцца павольна.*

Гучыць беларуская народная песня “Зайграй жа мне, дударочку” ў апрацоўцы А. Рашчынскага.

*Усе вяртаюцца на свае месцы, каза застаецца стаяць.*

***Дзед-Барадзед.*** Песні песнямі, танцы танцамі, але падыйшоў час пасвіць казу.

***Дзед.*** Дачка, трэба ісці пасвіць козачку, а то глядзі, як яна схуднела!

***Дачка.*** Добра, татачка!

*Дачка падыходзіць да казы.*

***Дзед-Барадзед.*** Цэлы дзень дачка пасвіла казу па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы.

Гучыць “Лявоніха”.

*Танцавальная замалёўка казы з дачкой.*

***Дзед-Барадзед.*** Увечары прыганяе дачка казу дахаты. Дзед і пытаецца ў казы…

***Дзед.*** Каза мая, козачка, дзе была?
Што ты ела, што піла?

***Каза.*** Нідзе не была.
Нічога не ела, нічога не піла.
Толькі як бегла цераз масток,




Ухапіла кляновы лісток,
А як бегла ля крыніцы,
Ухапіла кропельку вадзіцы…

***Дзед-Барадзед.*** Пачаў сварыцца дзед на дачку…

***Дзед.*** Чаму так дрэнна пасвіла казу? Зараз табе я пакажу!

***Дачка.*** Не сварыся, родненькі!

*Дачка вяртаецца на месца, каза застаецца стаяць.*

***Дзед-Барадзед.*** Назаўтра вырашыў дзед бабу выправіць пасвіць казу.

***Дзед.*** Жонка, трэба ісці пасвіць казу, але глядзі ў мяне, каб усё было добра!

***Баба.*** Пайду, што рабіць.

*Баба падыходзіць да казы.*

***Дзед-Барадзед.*** Цэлы дзень баба пасвіла казу па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы.

Гучыць “Лявоніха”.

Танцавальная замалёўка казы з бабай.

***Дзед-Барадзед.*** Увечары прыганяе баба казу дахаты. Дзед зноў пытаецца ў казы…

***Дзед.*** Каза мая, козачка, дзе была?
Што ты ела, што піла?

***Каза.*** Нідзе не была.
Нічога не ела, нічога не піла.
Толькі як бегла цераз масток,
Ухапіла кляновы лісток,
А як бегла ля крыніцы,
Ухапіла кропельку вадзіцы…

***Дзед-Барадзед.*** Пачаў сварыцца дзед на бабу…

***Дзед.*** Чаму так дрэнна пасвіла казу? Зараз табе я пакажу!

***Баба.*** Не сварыся, стары! Раз такі разумны, ідзі сам пасвіць казу!

*Баба вяртаецца на месца, каза застаецца стаяць.*

***Дзед-Барадзед.*** Надзеў тады дзед бабіну хустку ды пайшоў пасвіць казу.

*Дзед падыходзіць да казы.*

***Дзед-Барадзед.*** Цэлы дзень пасвіў па бары, па дубраўцы, па траўцы, па мураўцы.

*Выходзяць усе дзеці.*

Танец “Полька Янка” (беларуская народная ў апрацоўцы М. Літвіна).

*Усе вяртаюцца на свае месцы, каза застаецца стаяць.*

***Дзед-Барадзед.*** Увечары вярнуўся дзед дахаты, пераапрануўся і пытаецца ў казы…

***Дзед.*** Каза мая, козачка, дзе была?
Што ты ела, што піла?

***Каза.*** Нідзе не была.
Нічога не ела, нічога не піла.
Толькі як бегла цераз масток,
Ухапіла кляновы лісток,
А як бегла ля крыніцы,
Ухапіла кропельку вадзіцы…

***Дзед-Барадзед.*** Узлаваўся дзед на казу…

***Дзед.*** Ах ты, манюка злосная! Ну трымайся…

***Дзед-Барадзед.*** Прывязаў казу за плот, а сам пайшоў касу вастрыць.

***Дзед.*** Які будзе зараз смачны суп з казы!

***Дзед-Барадзед.*** Як пачула каза гэтыя словы, спужалася, сарвалася з прывязі і пабегла ў лес.

*Гучыць музыка, каза бяжыць.*



***Дзед-Барадзед.*** Знайшла каза ў лесе зайчыкаву хатку, залезла ў яе і жыве там, а зайчыка і на парог не пускае. Сеў зайчык пад елачкай і плача. Ідзе воўк…

*Гучыць музыка, ідзе воўк.*

***Воўк.*** Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

***Зайчык.*** Як жа мне не плакаць, як жа не журыцца?

Нейкі звер прыйшоў рагаты,
Выгнаў мяне з новай хаты…
Не пускае мяне, адзін там жыве!

***Воўк.*** Зайчык, не журыся, лепш павесяліся!

Спачатку аркестр будзем ствараць,
А потым твайго звера выганяць!

*Выходзяць усе дзеці, бяруць музычныя інструменты, становяцца перад тэлевізарам.*

Музычны відэааркестр “Бульба”.

*Усе вяртаюцца на свае месцы.*

***Дзед-Барадзед.*** Падышоў воўк да зайчыкавай хаткі, пастукаў хвастом у дзверы і кажа…

***Воўк.*** Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

***Дзед-Барадзед.*** А каза як затупае за дзвярыма, як замэкае…

***Каза.*** Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

***Дзед-Барадзед.*** Спужаўся воўк ды ад бяды ўцёк. А зайчык зноў сеў і плача. Ідзе мядзведзь.

*Гучыць музыка, ідзе мядзведзь.*

***Мядзведзь.*** Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

***Зайчык.*** Як жа мне не плакаць, як жа не журыцца?

Нейкі звер прыйшоў рагаты,
Выгнаў мяне з новай хаты…
Не пускае мяне, адзін там жыве!

***Мядзведзь.*** Зайчык, не журыся, лепш павесяліся!

Спачатку будзем мы гуляць,
А потым твайго звера выганяць!

***Дзед-Барадзед.*** Мядзведзь пакуль па лесе ішоў, вось якую лыжку знайшоў!

*Паказвае драўляную лыжку.*

*Выходзяць усе дзеці.*

Беларуская народная гульня “Гарлачык” (2 разы)

Дзеці сядаюць у кола на кукішках – яны “гарлачыкі”. Па крузе ходзіць “пакупнік”, спыніўшыся каля каго-небудзь, пытаецца: “Колькі каштуе гарлачык?”

Дзеці (Усе ўстаюць, акрамя “гарлачыка”) адказваюць:

За гарлачык гэты
Дай нам зусім крышку,
Каб ніколі не хварэць –
Маннай кашы лыжку!

Пасля гэтых слоў “пакупнік” кладзе каля выбранага “гарлачыка” драўляную лыжку. “Гарлачык” паднімаецца і бяжыць па крузе ў адным напрамку, а “пакупнік” – насустрач яму. Кожны імкнецца першым узяць лыжку. Той, хто першы, становіцца “пакупніком”.

*Усе вяртаюцца на свае месцы.*

***Дзед-Барадзед.*** Падышоў мядзведзь да зайчыкавай хаткі, патупаў каля дзвярэй ды кажа…

***Мядзведзь.*** Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі!

***Дзед-Барадзед.*** А каза як затупае, як замэкае…

***Каза.*** Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

***Дзед-Барадзед.*** Спужаўся і мядзведзь ды ў гушчар – кульгець, кульгець... Ідзе па лесе певень, такі важны і прыгожы.

*Гучыць музыка, ідзе певень.*

***Дзед-Барадзед.*** Убачыў заплаканага зайчыка і пытаецца…

***Певень.*** Чаго, зайчык, плачаш? Чаго ты зажурыўся?

***Зайчык.*** Як жа мне не плакаць,
як жа не журыцца?
Нейкі звер прыйшоў рагаты,
Выгнаў мяне з новай хаты…
Не пускае мяне, адзін там жыве!

***Певень.*** Зайчык, не журыся, лепш павесяліся!

*Выходзяць усе дзеці.*

Песня-гульня “Кукарэку, певунок” (словы народныя, музыка В. Сярых) (2 разы)

*Усе вяртаюцца на свае месцы.*

***Дзед-Барадзед.*** Падышоў певень да зайчыкавай хаткі ды кажа…

***Певень.*** Тваю бяду я адной лапай развяду! Гэта ж дзедава каза-манюка!

***Дзед-Барадзед.*** І як залопае крыламі, закукарэкае…

***Певень.*** Кукарэку! Кукарэку!
Заб’ю казу-недарэку!

***Дзед-Барадзед.*** Пачула каза ды як затупае, як замэкае…

***Каза.*** Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

***Дзед-Барадзед.*** Тады певень яшчэ мацней залопаў крыламі і закрычаў…

***Певень.*** Гэй, каза, збірай манаткі,
Уцякай хутчэй ты з хаткі.
Бо вунь дзед ідзе,
Ён касу нясе...

***Дзед-Барадзед.*** Як пачула каза пра дзеда з касою, напужалася і кулём выскачыла з хаткі.

*Пад музыку каза бяжыць.*

***Дзед-Барадзед.*** А зайчык з пеўнікам з таго часу сталі там жыць-пажываць ды дабра нажываць. І ўсё ў іх хатцы ладзілася!

*Выходзяць усе дзеці, становяцца павольна.*

Песня “Чаму ж мне не пець” (беларуская народная)

***Дзед-Барадзед.*** Вось і скончылася наша казка. Усім спадабалася?

***Дзеці.*** Так!

***Дзед-Барадзед.*** Калі ласка!

*Дзеці становяцца паўкругам, бяруцца за рукі.*

***Дзед-Барадзед.*** Дзверы тэатра зачыняюцца, артысты да дому адпраўляюцца!

Песня “Бывайце здаровы” (словы А. Русака, музыка І. Любана).

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А мы ад’язжаем да дому,
Да хаты.
У зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем.
І вашае ласкі
Вавек не забудзем.

*Дзеці спяваюць першы куплет, на другі – выконваюць паклон, развітваюцца, за Дзедам-Барадзедам выходзяць з музычнай залы.*